— • Весткі са школ

ВЕСЕЛА, СВЯТОЧНА І ПАЗНАВАЛЬНА

Кожны год першага верасня школа абуджаецца да жыцця, напаўняецца радаснымі дзіцячымі галасамі. Разам з нашымі вучнямі мы чакаем гэта цудоўнае свята — Дзень ведаў.

1 верасня і ў нашай установе адукацыі прайшла лінейка, прысвечаная Дню ведаў. Вучні ўсіх класаў, прыгожыя і па-святочнаму апранутыя, чакалі свайго першага званка. Асабліва важным гэты дзень лічыцца для першакласнікаў. Яны з захапленнем глядзелі на вялізны будынак школы і на сваіх настаўнікаў. Дырэктар навучальнай установы А. М. Радзько прадставіў новых педагогаў і пажадаў усім поспехаў у новым навучальным годзе.

На урачыстай лінейцы прысутнічалі і госці: Грашылава Н.У., Ткач С.А., Ізох А.І. Яны павіншавалі ўсіх прысутных і ўручылі прыемныя падарункі школе.

Пасля лінейкі прайшоў першы ўрок "Беларусь – мая Айчына". Тэма гэта не выпадковая. У нашай незалежнай, квітнеючай, мірнай краіне кожны чалавек можа рэалізаваць сябе як прафесіянал, кожнае дзіця здольна выбраць свой жыццёвы шлях. А задача настаўніка — прывіць навучэнцу любоў да сваёй Айчыны, гордасць за яе слаўнае і гераічнае мінулае. Працягам свята для старэйшых класаў паслужыла гульня, якую правялі маладыя настаўніцы Мароз К.Р. і Дайлідка В.А. Мерапрыемства было прысвечана 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. На ім прагучалі словы пра славутых асветнікаў, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў Беларусі. Лепш за ўсіх гісторыю беларускай друкаванай кнігі ведалі вучні 9 класа, якія сталі пераможцамі. Для малодшых класаў быў арганізаваны прагляд кінафільма, а для сярэдніх – экскурсія ў школьны краязнаўчы музей.

1 верасня ў ДУА "Дзмітраўскі ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа" прайшло не толькі весела і святочна, але і пазнавальна.

Кацярына МАРОЗ, настаўнік гісторыі ДУА "Дзмітраўскі ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа".



— • Культура: ініцыятывы, інвестыцыі

ТВОРЧАСЦЬ БЕЗ МЕЖАЎ

Як вядома, УК "Клічаўскі краязнаўчы музей" у ліку 5 арганізацый-заяўнікоў з нашага раёна стала пераможцай Асноўнага конкурсу мясцовых ініцыятыў, які здзяйсняецца ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь", фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. Міжнародную дапамогу атрымала яго ініцыятыва "Творчасць без межаў".

«Донарам» з'яўляецца Еўрасаюз. Ён выдзеліў музею 14 536 еўра на абсталяванне сацыяльнай выставачнай залы, якая адпавядае сучасным тэхнічным і эстэтычным патрабаванням. Такая выставачная прастора даўно была патрэбна нашаму гораду. Цяпер тут з'явіцца магчымасць публічнай прэзентацыі творчасці людзей, якія адносяцца да сацыяльна-уразлівых груп насельніцтва. Яны змогуць не толькі прадставіць свае работы шырокай публіцы, але і рэалізаваць іх.

Зараз выставачная зала з сучаснымі вітрынамі, падвясным абсталяваннем, падсветкай (трэкінгавая сістэма асвятлення), мультымедыйным суправаджэннем і г.д. ужо абсталёўваецца.

Партнёрамі ініцыятывы музея з'яўляюцца раённы цэнтр сацыяльнай абароны насельніцтва, ДУДА "Цэнтр дзіцячай творчасці", ДУА "Дзіцячая школа мастацтваў", раённы Дом рамёстваў.

У ходзе рэалізацыі ініцыятывы да яе далучыліся раённы савет ветэранаў, раённая арганізацыя ГА "Беларускае таварыства інвалідаў". Але экспанаваць свае творчыя работы ў будучай сацыяльнай выставачнай зале музея змогуць не толькі члены арганізацый-партнёраў або іх выхаванцы, а і жыхары раёна – самадзейныя мастакі, народныя майстры – увогуле, творцы, якія жадаюць папулярызаваць сваю творчасць, як кажуць , "выйсці на прастор жыцця", завязаць новыя творчыя знаёмствы, устанавіць кантакты, а яшчэ і прадаць свае работы.

Зараз у раённым музеі праведзены касметычны рамонт памяшкання будучай сацыяльнай выставачнай залы, устаноўлена новая падвясная сістэма для ўмацоўвання работ, абноўлена асвятляльнае абсталяванне. На чарзе – набыццё і ўстаноўка сучасных выставачных вітрын.

Музей ужо фарміруе калекцыі работ для будучых мерапрыемстваў. А іх у рамках рэалізацыі ініцыятывы запланавана нямала. Гэта тры сацыяльныя выстаўкі, у тым ліку выстаўка-адкрыццё сацыяльнай залы, у час якой будуць урачыста прадстаўлены партнёры праекта, удзельнікі -аўтары работ. Плануецца да правядзення і выстаўка-аўкцыён, якая дасць магчымасць рэалізаваць лепшыя выставачныя работы. Думаецца, нямала людзей збяруць майстар-класы, якія пройдуць для наведвальнікаў сацыяльнай выставачнай залы. Магчыма, яны стануць для кагосьці стымулам для творчасці.

Першыя экспанаты будучай выстаўкі прадастаўлены музею аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту РЦСАН. Больш за 30 работ, выкананыя яго выхаванцамі ў розных тэхніках, прыцягваюць сваёй незвычайнасцю, маляўнічасцю, пазітыўнай энергетыкай. Напрыклад, работы Ганны Вішнявецкай. Гэта дэкаратыўныя адкрыткі і адкрыткі-шакаладніцы, выкананыя ў тэхніцы скрапбукінгу (від рукадзелля, які заключаецца ў вырабе і афармленні фотаальбомаў), а яшчэ вышываныя, яркія пано "Маляўнічая сямейка", "Ружы", "Лебедзь", "Папугай". З цікавасцю пазіраюць на гледача вышываныя героі Алены Куранавай "Тыграня", "Сава", "Рысь", "Лось". Яркімі фарбамі квітнеюць на пано "Макі" Анастасіі Баўжэвіч і "Васількі" Аляксандра Тарноўскага.

Творцы старэйшага пакалення – Ніна Аркадзьеўна Клепча і Тамара Львоўна Маркава — парадавалі работамі дзіўнай прыгажосці – вязанымі кручком ажурнымі шалямі, сумачкамі, вытанчанымі вышыванымі падушачкамі-ігольшчыцамі ў тэхніцы "біскарню".

Музей запрашае да ўдзелу ў рабоце выставак творцаў Клічаўшчыны. Наша зямля спакон веку шчодрая на таленты, і думаецца, нас чакае нямала адкрыццяў і новых цікавых імён.

Ніна ІЗОХ.

— • Спортивный меридиан

СОРЕВНОВАЛИСЬ КОНТРОЛЁРЫ

В спорткомплексе «Стайки» состоялась ежегодная спартакиада работников Комитета государственного контроля. Участие в соревнованиях приняли команды Комитетов государственного контроля областей и центрального аппарата КГК.

В течение двух дней были разыграны награды в девяти видах программы, в том числе в соревнованиях по мини-футболу, настольному теннису, лёгкой атлетике, плаванию, дартсу, шашкам, гиревому спорту, стрельбе и перетягиванию каната. Команда Комитета госконтроля Могилёвской области стала бронзовым призёром спартакиады.

Кроме спортивных соревнований в ходе спартакиады состоялся конкурс художественной самодеятельности. Коллективы каждой из областей и центрального аппарата Комитета госконтроля продемонстрировали свои оригинальные программы.

Олег САДОВСКИЙ, председатель Комитета.